2 **НЯБЕСНАЯ “АТАКА”**
Аграрны сектар Івацэвіччыны пацярпеў ад моцнага граду



5 **ПРОЩАЙ, ШКОЛА!**
Состоялись праздники выпускников

6 **ПАКУЛЬ БУДЗЕ ЗАПАТРАБАВАНА НЯПРАЎДА**
Чарнобыльскія наступствы і лёсы дзяцей

выдаецца са студзеня 1997 года

ГАЗЕТА ДЛЯ ВАС

№ 26 (393)


27 чэрвеня — 3 ліпеня 2003 г.

ІВАЦЭВІЧЫ-БАРАНАВІЧЫ-БЯРОЗА-ПРУЖАНЫ-ДРАГІЧЫН

ВАСІЛЯ БЫКАВА БОЛЬШ НЯМА З НАМІ

22 чэрвеня, пасля цяжкай хваробы адышоў з жыцця вялікі беларускі пісьменнік і грамадзянін Васіль Быкаў.

Выдатны творца сусветнага маштабу, Васіль Быкаў увасабляў сабой сумленне беларускага народа. Мужны франтавік у гады Другой Сусветнай, абаронца праўды пра вайну ад афіцыёзных фальсіфікатараў. Маральны аўтарытэт Быкава непахісны. Да ягонага слова ў абарону Свабоды і Незалежнасці прыслухоўваліся літаральна ўсе беларусы — незалежна ад поглядаў. Нам усім будзе цяжка без Вас, Васіль Уладзіміравіч.



IREX/ProMedia.

МЫ НЕ СЫДЗЕМ СА ШЛЯХУ ПРАЎДЫ!

Не стала з намі выдатнага Пісьменніка, вялікага Чалавека, сапраўднага грамадзяніна Беларусі — Васіля Быкава. Усяго тры дні пражыў ён пасля свайго 79-годдзя.

Боль заўсёды сцінаў сэрца ад таго, што Васіль Быкаў павінен быў апошнія гады жыць за мяжой. Страх закрадваўся ў душу ад думкі, што мы Яго можам страціць. Крыўдна было за тое, што таленавіты Пісьменнік і крыштальна чысты Чалавек ўсё жыццё быў няўгодны ўладам і адціскаўся імі на задні план толькі за тое, што заўсёды шукаў Праўду і ніколі не здрадзіў ёй, не памяняў на цёплае крэсла і прыхільнасць чыноўнікаў.

Разам з Васілём Быкавым памерла ў кожнага з нас нейкая частачка душы. Яго месца не зможа запоўніць ніхто, але памяць аб ім, ягоныя творы заўсёды застануцца з намі. Усе мы, хто прыняў яго шлях, будзем рабіць усё для таго, каб свет Праўды сышоў на нашу зямлю, каб усё пачварнае згінула, як цень у поўдзень, каб заспакоілася ягоная душа, назіраючы за намі.

Сябры дэмакратычных арганізацый Бярозаўскага раёна.

“НЕ ПРЫМАЎ АГРЭСІІ Ў ЧАЛАВЕКУ...”

У 1992 годзе праходзілі Дні беларускай літаратуры ў Берліне, там быў і Васіль Уладзіміравіч. Ёсць здымак, на якім адлюстравана, як ён мяне вязе ў двары на гэтым маім “возіку”... Не скажу, што я добра ведала Быкава: не было магчымасці часцей сустракацца, размаўляць... Але заўсёды з глыбокай павагай да яго ставілася і стаўлюся (і гэта ўжо на ўсё жыццё), бо Быкаў арганічна не прымаў агрэсіі ў чалавеку, звераватасці яго, нялюдскасці ў думках і ўчынках. Ён сцвярджаў гэта ўсёй сваёй творчасцю. Ён сапраўды быў чалавекам, які шукаў подзвіг духу — і пісаў пра гэта. І гэта мне імпануе, мне гэта блізка, мне гэта родна...

Ён неяк казаў, што самае істотнае, што ён узяў у Хемінгуэя, — гэта не стаць дрэнню. І сам ён быў чалавекам высокамаральным, гуманным, інтэлігентным...

Ён быў падораны нам Лёсам — бо абераганы быў усю вайну. Абераганы ад смерці дзеля таго, каб прадэманстраваць нам сумленнасць, нязломнасць — нягледзячы на тое, што сам ён быў вельмі ўражлівым, ранімым чалавекам. Можа таму ён і быў заўсёды такі засяроджаны і сур’ёзны, і мала хто бачыў яго ўсмешлівым... А ўсмешка яго — шчырая і адкрытая...

Ніна МАЦЯШ, паэтка.

БЫКОВ ВАСИЛИЙ ВЛАДИМИРОВИЧ

Родился 19 июня 1924 г. в д. Бычки Ушацкого района Витебской области. Учился на скульптурном отделении Витебского художественного училища (1939 - 1940), в школе ФЗО. Экстерном сдал экзамены за 10 класс в июне 1941. Служил в Красной Армии (с лета 1942), окончил Саратовское пехотное училище. С 1943 на 2-м и 3-м Украинских фронтах. Дважды ранен. Родители получили сообщение о его гибели. С действующей армией прошел по Румынии, Болгарии, Венгрии, Югославии, Австрии; старший лейтенант, командир взвода полковой, затем армейской артиллерии. Демобилизован в 1947. Работал в Гродно. Снова в Советской Армии (1949 - 1955).

С 1947 г. печатается. В 1972 — 1978 гг. секретарь Гродненского отделения Союза писателей БССР. Весной 1989 г. избран депутатом Съезда народных депутатов СССР, вошел в Межрегиональную депутатскую группу. В 1990 - 1993 гг. президент объединения белорусов мира “Бацькаўшчына”.

Покинул Беларусь в конце 1997 г. Вначале по приглашению ПЕН-центра Финляндии проживал в окрестностях Хельсинки, затем, получив приглашение ПЕН-центра ФРГ, переехал в Германию.

Творческую биографию принято отсчитывать от рассказов, написанных в 1951. Народный писатель Беларуси (1980), Герой Социалистического Труда (1984). Государственная премия СССР (1974), Государственная премия БССР имени Якуба Коласа (1978), Ленинская премия (1986). По произведениям Быкова поставлены фильмы “Третья ракета” (1963), “Альпийская баллада” (1966), “Дожить до рассвета” (1975), “Волчья стая” (1976), “Обелиск” (1977), “Восхождение” (по повести “Сотников”, 1977), “Знак беды” (1985); телефильмы “Долгие версты войны” (1976, по повести “На рассвете”), созданы балет “Альпийская баллада” (1967) и опера “Тропою жизни” (1980).

ТЫДЗЕНЬ СМУТКУ

Паважаныя сябры! Шануючы памяць вялікага Беларуса, Дабрачынны фонд рэгіянальнага развіцця “Наша Вежа” звяртаецца да ўсіх грамадскіх аб’яднанняў і ініцыятыўных груп Брэста і вобласці з ініцыятывай правядзення **ТЫДНЯ СМУТКУ**, устрымаўшыся на гэты тэрмін ад забаўляльных мерапрыемстваў. Фонд “Наша Вежа” плануе правесці ў ліпені літаратурную **ВЕЧАРЫНУ-РЭКВІЕМ** у гонар пісьменніка і прапануе ўсім супрацоўнікам бібліятэк горада і вобласці далучыцца да гэтай ініцыятывы ў сваіх гарадах, а ў верасні арганізаваць сярод школьнікаў **КОНКУРСЫ САЧЫНЕННЯЎ на тэму “З Быкавым у сэрцы”**.

“Наша Вежа”.

КИСЕЛЬНЫЕ БЕРЕГА ОБЕЩАЛИ...

ПРУЖАНЫ. А молочные реки уже мелеют: в целом, по итогам первого полугодия 2003 года, закуп молока снизился практически по всем сельским Советам Пружанщины.

Снижение составило десятки процентов. От одной коровы поступление молока на перерабатывающие заводы уменьшилось катастрофически: если в марте минус составлял один процент, то в мае — 8-10%, а это до 80 литров в месяц (!).

Проблема, скорее всего, в закупочных ценах. С 1 июня произошло очередное... понижение их на 30 рублей. Теперь один литр этого ценнейшего продукта стоит 200 рублей (для сравнения, в магазине литровый пакет молока, с которого сняты все "вершки", стоит в три раза больше). Как объясняют представители мясомолпрома, считается, что летом молочко даётся без больших усилий. Мол, неужто тяжело на свежем воздухе косой помахать?

В дополнение наблюдается и такая тенденция — сокращается количество подворьев, на которых держали по две-три коровы. По каждому сельсовету сокращение составляет от 20 до 80 голов. Люди вообще отказываются от сдачи молока государству, предпочитая самим заниматься его реализацией.

Николай АРАБЕЙ.

Нябесная "атака"

ІВАЦЭВІЧЫ. Шэраг гаспадарак раёна, прыватны сектар моцна пацярпеў у пятніцу, 20 чэрвеня, калі вечарам на раён абрынуўся моцны град.

Як паведамілі ва ўпраўленні сельскай гаспадаркі і харчавання, стыхія мела выгляд "каўровых бамбардзіровак". Практычна не закранута Целяханшчына і Быценшчына, а вось пасевы ў Косаўскай і Івацэвіцкай зонах (у межах гаспадарак "Бальшавік", "Косава", "Любішчыцы", "Савецкая Беларусь", АФК "Беларусь") пацярпелі вельмі значна. Сярод знішчанага — пасевы азімай і яравой пшаніцы, ячменя, бульбы, кукурузы, ільну, цукровых буракоў.

Вадзім ЖУК.

Преступность молодеет

ИВАЦЕВИЧИ. Сотрудниками уголовного розыска Ивацевичского РОВД была задержана группа из двух несовершеннолетних жителей г. Ивацевичи, которые совершили угон автомобиля. Машина была обнаружена в тот же день в д. Стайки. По данному факту ведётся следствие, статья предусматривает до пяти лет лишения свободы. Эти же несовершеннолетние подозреваются в совершении еще нескольких подобных краж.

В ночь на 19 июня была задержана еще одна группа несовершеннолетних. Две девушки (!) попались при попытке взлома и последующей кражи из коммерческого киоска. Одна из них является учащейся одной из школ г. Ивацевичи, вторая — не учится. Возбуждено дело по ст. 205 ч. 2, предусматривающей наказание до пяти лет.

Алексей ГРИШИН.

Дружим с НАТО?

БАРАНОВИЧИ. Находящаяся с визитом в Беларуси делегация командования объединенных ВВС НАТО, представленная делегатами из Чехии, Норвегии, Венгрии и Бельгии, посетила в рамках программы "Партнерство ради мира" 61-ую авиабазу и Барановичский 558-ой авиаремонтный завод. Посещение носило ознакомительный характер.

Павел СВИСТУНОВИЧ.

Черника на экспорт

ИВАЦЕВИЧИ. Конец июня каждый год отмечается повышенным интересом большинства наших сограждан к проблемам сбора и реализации даров леса, садов и огородов — черники, смородины, вишни, клубники, грибов.

К примеру, в прошлом году жители Ивацевичского района били все областные рекорды по сбору и сдаче черники.

— Ни в какое сравнение не идёт заготовка-2003 с 2002 годом. Можно уже теперь говорить однозначно: урожай не удался, — так охарактеризовали "Газете для вас" старт сезона экономисты Ивацевичской заготконторы. — Шутка ли: только за июнь прошлого года мы уже приняли ...40 тонн черники. Весна тогда была ранней, урожай богатый. Причём на все ягодные, а сегодня, как показывает анализ, клубника не удалась, вишня тоже. Мрачные прогнозы и на чернику. Есть сведения, что она не удалась также.

Это значит лишь то, что вся принятая нами черника пойдёт на экспорт. Поэтому цена будет относительно высокой. Мы будем ориентироваться на цены иных структур; наша цена будет около 1000 рублей и выше.

Кстати, в этом плане сдатчик имеет некоторую альтернативу. На Брестчине свою сеть раскинули некоторые организации, тоже занимающиеся заготовками. Так, ИП "Терсет-Вест" через своих региональных представителей (они есть в каждом районе области) закупает у населения клубнику за 1200 рублей, чёрную и красную смородину за 1000, чернику за 1200, лисички — 5000 рублей за килограмм.

Александр МИХАЛЕНКО.

Взрыв в Пружанах

ПРУЖАНЫ. Водонапорную башню, построенную еще 50 лет назад возле парка, взорвали. Она была сооружена настолько прочно, что другими методами снести ее не представлялось возможным. Взрыв производили сотрудники Пинского аварийно-спасательного отряда МЧС РБ. Взорвали профессионально — кирпичи при взрыве разлетелись не далее, чем на пять метров. В близлежащих домах были приняты все необходимые меры безопасности: выведены люди, открыты окна. При взрыве было использовано шесть килограмм аммонита.

Николай АРАБЕЙ.

І радасць, і непрыемнасць

БЯРОЗА. З аднаго боку, Боркаўскай сярэдняй школе Бярозаўскага раёна пашанцавала: да іх у госці прыязджала дэлегацыя з Люксембурга. Госці ўзнагародзілі выдатнікаў вучобы грашовымі прэміямі у памеры 100 у. а. (а іх было трое). Проста за добрую вучобу давалі па 50 у. а. і ніжэй.

А з другога боку, гэтую ж школу, якая ўжо 20 гадоў не ахоўваецца, абакралі. Злодзеі скралі два камп'ютэры з манітрамі, відэаапаратуру, магнітафон і 90 тысячаў рублёў, якія сабралі настаўнікі, каб пачаставаць гасцей..

Тамара ШЧАПЁТКІНА.

Воруют и берут

БАРАНОВИЧИ. Растет число преступлений в сфере экономики. В течение этого года в городе уже зафиксировано 118 преступлений, что на одну треть больше, чем за этот же период прошлого года.

Раскрыто 12 случаев взяточничества (в прошлом году — 6). За незаконные операции с валютой 65 человек были привлечены к административной ответственности. У них было конфисковано 1,5 миллиона белорусских рублей, 1000 рублей России и 3500 долларов.

Также работниками милиции было изъято 2300 бутылок фальсифицированной водки и 9000 литров спирта на общую сумму 24900 тысяч рублей.

Павел СВИСТУНОВИЧ.

Прайшлі паломнікі

ПРУЖАНЫ. Па ініцыятыве каталіцкай царквы ў чэрвені быў арганізаваны хрэсны ход па святых месцах Беларусі. Пачалося паломніцтва ў пачатку месяца ў Гродне. 19 чэрвеня пешыя вернікі прайшлі праз Пружаншчыну па маршруце Шарашова-Кабылаўка-Ружаны. Скончыўся хрэсны ход каталікаў у канцы чэрвеня ў в. Будслаў Мядзельскага раёна.

Мікалай АРАБЕЙ.

Полный коллапс

БАРАНОВИЧИ. Остановилась работа на трикотажной фабрике "Баверти". Энергетики отключили производство за долги. Работники фабрики зарплату не получали еще за март.

Надежды, возложенные на кредит, обещанный государством, не оправдались — его попросту не дали. Да и есть ли смысл давать кредит, который будет уходить на долги? А возвращать как?

Павел СВИСТУНОВИЧ.

РЫНКАВАЯ ПЛОШЧА

Цэны на прадуктовых рынках нашага рэгіёну па стану на 25.06.2003 г. (у руб. за адзін кілаграм)

	Івацэвічы	Баранавічы	Бяроза	Пружаны	Драгічын
Свініна	3800—6500	3500—7000	3500—7000	3600—6500	3700—6000
Сала салёнае	2500—4000	2500—4500	2800—3800	3800—4400	3000—4000
Алей (1 л)	1700—2300	1700—2400	1800—2500	1700—2300	1700—2200
Яйкі (1 дзяс.)	1300	850	1500	1300	1300
Малако (3 л)	1200	1200	1200	1200	1200
Тварог	1500—1600	1600—1800	2000	1500—1600	1500—1600
Бульба	450	300—500	2000	350—450	300—450
Масла сметанк.	4200—4400	4000—4300	5000	4500	4000
Цыбуля	1200	1000—1200	1200	800—1200	1100
Морква	1800	1100	1800	1600	1600
Персікі	7500	7200	7500	7000	7200
Селядцы	2400—2600	2100—2500	2300—2500	2400	2300—2500
Грэцкія арэхі	3000	3000	—	3000—3500	2500—3000
Яблыкі	2700—3000	1700—2500	3000	1500—2500	2000—3000
Капуста	600—800	800	900	800—2000	900—1000
Вінаград	6000—6500	5000—6500	6000	6500—7000	5500—6500
Клубніцы	3000	3000—3500	3000—3500	3000—3500	3000—3500
Агуркі	600—1000	650—1000	1200	600—1000	600—900
Лімоны	2800	2500—2700	2900	2800	2500—3000
Апельсіны	2100—2200	2200	2200	2000—2200	1800—2200
Мандарыны	3200	3000—3200	3500	3000	2800—3500
Бананы	1800—2000	1800—2000	1800—2000	1800—2200	2000
Грэчка	1550	1500	1700	1200	1300
Макар. вырабы	650—800	600—900	700—900	700—800	700—800
Рыс	800—1100	850—1200	750—1100	850—1100	800—1100
Манныя крупы	—	650	700	650	600
Проса	1200	900—1200	1200	1100	1000
Цукар	1280	1280	1280	1270	1200
Мёд	6500—8000	7000—8000	7000	7000	6500—7000

ВАЛЮТА НА "ЧОРНЫМ" РЫНКУ (руб.)

	купля	продаж	купля	продаж	купля	продаж	купля	продаж	купля	продаж
1 долар ЗША	2050	2070	2050	2065	2040	2060	2050	2060	2050	2060
1 еўра	2370	2450	2400	2450	2430	2460	—	—	2400	2450
1 рубель Расіі	66	68	66	68	66	67,5	66	68	66	68

В г. Ивацевичи стоимость мелких купюр $ 1 — 2150 руб.

Жуткое убийство

ИВАЦЕВИЧИ. Жуткое убийство произошло в д. Елки Ивацевичского р-на 24 июня. Преступник убил женщину 1923 г. р. и, дабы скрыть следы преступления, поджёг дом. На момент подписания номера в печать преступник находился в розыске. Всех, кому известно местонахождение лица, изображенного на фото, просим позвонить по телефонам: 2-22-02, 2-15-87, 2-26-52.



За рулем небяспечна

БЯРОЗА. Непадалёку ад горада адбылося дарожна-транспартнае здарэнне, у якім загінулі два мужчыны з Броннай Гары. Адзін з іх былы ваеннаслужачы, другі — прапаршчык вайсковай часці, размешчанай на Броннай Гары.

Машына на вялікай хуткасці з'ехала з дарогі і ўдарылася ў прыдарожнае дрэва.

Тамара ШЧАПЁТКІНА.

ПОЖАР ЛЕГЧЕ ПРЕДУПРЕДИТЬ

Слушает дежурный репортёр...

Выполняя обязанности дежурного репортёра, слышишь порой очень интересные, а иногда даже странные вопросы. Так, например, можно отметить следующий диалог между вашим покорным слугой (автором этих строк) и читателем:

ЧИТАТЕЛЬ: — Алло, это редакция "Газеты для вас"?

КОРРЕСПОНДЕНТ: — Да, слушаем Вас.

ЧИТАТЕЛЬ: — Скажите, а вы знаете белорусский язык?

КОРРЕСПОНДЕНТ: — Владею и довольно часто пользуюсь в быту.

ЧИТАТЕЛЬ: — Ну, тогда скажите, правильное ли выражение футбольных комментаторов, которое на белорусском языке звучит как "Сам-насам"?

Что ж, отвечаем Вам, уважаемый наш читатель: "гэты выраз — сам-насам — найбольш часта ўжываемы і дакладны на беларускай мове і выкарыстанне гэтага словазлучэння спартыўнымі каментатарамі дакладнае і правільнае".

Из деревни Холопья Ивацевичского района позвонила Татьяна Грищеня. Проблема, с которой она обратилась в редакцию "Газеты для вас", в том, что каждое лето возле её деревни загорается лес или торфяник. Так и в этом году. Несколько дней продержалась высокая температура, земля подсохла, и вновь загорелся лес. Всё бы ничего, да рядом жилые дома, где всегда много детей, а ещё недалеко проходит газопровод. "И на фоне всего этого звоним в пожарку, ждём целый час, а машины нет, — возмущается Татьяна, — хотя при повторном звонке сообщается, что пожарные уже в пути".

Ситуацию эту комментирует **Виктор Иванович РАБЧЕНЯ, заместитель начальника Ивацевичского РОЧС по оперативно-тактической работе.** Его пояснения по поводу этой ситуации сводятся к следующим моментам:



Сергей Скуловец.

во-первых, жители д. Холопья сами в большей части виноваты в возникающих пожарах. В лесу или на торфяниках необходимо быть внимательными и осторожными с открытым огнём. Пожар легче предупредить, чем потушить;

во-вторых, если на месте пожара нет синих маячков пожарных машин, то это не значит, что на объекте нет сотрудников РОЧС. Дело в том, что подобных вызовов, касающихся возгорания леса, торфяника, довольно много. Поэтому первоначально на место вызова выезжает дежурный от инспекции, который оценивает ситуацию, проводит первоначальное расследование. И уже далее сообщает, есть угроза от возгорания или нет;

в-третьих, согласно решению Брестского областного исполнительного комитета, ликвидация пожаров в лесах, на торфяниках возложена на землепользователей. Поэтому в лесных хозяйствах (в данном случае в Ивацевичском, Телеханском лесхозах) созданы пожарно-химические станции, которые занимаются тушением пожаров. А со стороны РОЧС помощь поступает тогда, когда ситуация действительно критическая.

Из деревни Воля Ивацевичского района с вопросом, когда отремонтируют дорогу, что идёт вдоль деревни, позвонил Владимир Кот.

На вопрос этот прозвучал очень краткий и внятный ответ **Александра Николаевича ОСТАШКО, директора ДРСУ-178,** который сказал, что данный участок дороги будет ремонтироваться в текущем году.

Дзе варта быць?

Івацэвічы

27 ЧЭРВЕНЯ	17.00 Закрыццё летніх аздараўленчых лагераў: спартыўна-танцавальна-забаўляльная праграмма.	Івацэвіцкі ГДК
29 ЧЭРВЕНЯ	20.00 Танцавальна-забаўляльная праграма "Лета зорнае, будзь са мной".	Івацэвіцкі ГДК
3 ЛІПЕНЯ	10.00 Мітынг, прысвечаны Дню незалежнасці; 10.30 Канцэрт хора ветэранаў вайны і аматарскага аб'яднання "Спадчына"; 12.00 Свята кнігі; 17.00 Дзіцячыя гульнявыя праграмы, спартыўныя гульні і спаборніцтвы; 19.00 Выступленне народнага духавога аркестра; 20.00 Забаўляльна-гульнёвая праграма.	Плошча каля дома Саветаў

Пружаны

3 ЛІПЕНЯ	Авіяшоу і канцэрт, прысвечаны Дню незалежнасці РБ і 30-годдзю верталётнай базы	182-ая верталётная база, в. Новыя Засімавічы Пружанскага раёна

Бяроза

29 ЧЭРВЕНЯ	14.00 Гульнявыя, спартыўныя, забаўляльныя праграмы і канцэрты, прысвечаныя Дню моладзі	Стадыён ў Паўночным гарадку
3 ЛІПЕНЯ	Дзень дзяржаўнай незалежнасці, канцэрт	Бярозаўскі ГДК

Нарэшце, памыемся

Некалькі слоў пра гарачую водазабяспечанасць ў г. Івацэвічы

Згодна з графікам выпрабавання абсталявання кацельных і цеплавых сетак і ў мэтах іх падрыхтоўкі да работы ў асенне-зімовы перыяд зараз КУШВП ЖКГ "Івацэвіцкая ЖКГ" ажыццяўляюцца адключэнні падачы гарачай вады да жылых дамоў і, адпаведна, падключэнні там, дзе выпрабаванні скончыліся. Падрыхтоўка да новага сезону ў поўным разгары.

Але падключэнне аб'ектаў будзе ажыццяўляцца не ў тым аб'ёме, які быў да пачатку выпрабаванняў. Падрыхтаваны дакумент, паводле якога гарачая вада будзе падавацца ў Івацэвічах **ў пятніцу з 18.00 да 23.00, у суботу і нядзелю з 6.00 да 23.00.**

З 27 чэрвеня гарачая вада з'явіцца на самым густанаселеным аб'екце — вул. Механізатараў, Чарткова, 60 год Кастрычніка, Шаўчэнкі, Чкалава, Дэпутацкая (36 — 41\2), Леніна (43а, 50, 49, 51), Камсамольская (21), Калініна (2, 4).

З 30-га чэрвеня рамонт сетак пойдзе па вуліцах 70 год Кастрычніка, Дэпутацкая (43\1, 43\2, 45\1, 45\2), Механізатараў (9). Гарачай вады тут не будзе да 11-га ліпеня.

Практычна не закране адключэнне жыхароў вул. Клютко (35, 53, 33), Леніна (62, 64, 66, 70) — тут рамонт пачнецца ў панядзелак, 14 ліпеня, а скончыцца ў пятніцу, 18 ліпеня. Тая ж сітуацыя на вул. Леніна (15\1, 16), Матросава (15, 28, 30, 32), 40 год БССР (3); тут рамонт пачнецца 21 ліпеня, а скончыцца 25 ліпеня.

Будзем спадзявацца, што планы работнікаў камунальных служб (і нашы планы) збудуцца.

Аляксандр МІХАЛЕНКА.
г. Івацэвічы.

Нужны такие сельсоветы?

Мой возраст и жизненный опыт не позволяют мне молчать о том, о чём нужно было говорить всем нам давно. Тогда бы такой нужный и важный рычаг власти, как Советы, не стал бы пустой привязкой к власть имущим. Ведь сейчас сельсоветы в нынешнем виде ничего не решают самостоятельно, потому что основное финансирование поступает от предприятия, которое находится на одной территории с Советом.

Возьмём, к примеру, наш Песковский сельский Совет. В упор не вижу реальной работы нашего сельсовета под руководством Н. Марчука. Может, я не прав, поэтому хотелось бы, чтобы и другие люди высказались по этому поводу.

Хочется, чтобы Н. Марчук отчитывался за свою работу перед народом и перед своими избирателями. Например, о том, что сделано для благоустройства деревень, находящихся на территории Песковского сельсовета? Кому адресно из бедных, престарелых и многодетных семей оказана материальная помощь и в каком размере? Их ведь у нас немало.

Кому и в каком размере выделена субсидия на строительство? Кому и в каком количестве выделен кирпич для ремонта печей? Кому и сколько сделано или отремонтировано заборов? Как ремонтируются дороги и как убираются мусорные свалки?

На первый взгляд кажется, что сельсовет имеет отношение к земельным наделам и пастбищам. Но на самом деле выделением земли, её обработкой, подкормкой пастбищ занимается совхоз. Вопросами сбора молока от населения — тоже совхоз. Вот и думаешь, зачем же держать штат сельсовета и платить им немаленькую зарплату?

Хочется, чтобы народ был в курсе того, что происходит, хорошее оно или не очень.

Глядя на работу нашего Песковского сельсовета, делаю вывод, что Советы в нынешнем виде не нужны.

Василий БУЯНОВ.
д. Пески Берёзовского района.

Ці змянілі б вы сельскае жыццё на гарадское?

Адказваюць жыхары в. Быцень Івацэвіцкага раёна



АЛЯКСАНДР УЛАДЗІМІРАВІЧ: Шчыра кажучы, не. Я — чалавек вясковы, гарадское жыццё мне не падабаецца, тым больш што сваю вёску Быцень я вельмі люблю.



ГАННА ІОСІФАЎНА: Зараз памяняла б. Узрост у мяне пенсійны, хочацца зручнасцяў. На невялікі горад вёску памяняла б. Хаця, калі б зручнасці тут з'явіліся, — ні за што!



МАРЫЯ МІКАЛАЕЎНА: Ні ў якім разе! А навошта? У мяне ўсе зручнасці — і ацпленне, і водазабеспячэнне. Брат і сястра мае жывуць у гарадах — я ім не зайздрошчу.



ВАЛЯНЦІНА МІКАЛАЕЎНА: Думаю, што з'ехала б у горад, калі была б такая магчымасць. Вёска — гэта значыць многа працы на зямлі, а зямля любіць маладых і здаровых.



ВАДЗІМ: Канешне, памяняў бы. І з вялікім задавальненнем. А што вёска? Да прыкладу, Быцень? Беспрацоўе! А калі і знойдзеш работу, то зарплаты проста смешныя.



ВІКА, ЛЮДА: З задавальненнем памянялі б. У вёсцы, ведаеце, добра адпачываць летам, а вось працаваць і жыць лепш у горадзе. Тым больш там ёсць куды вечарам схадзіць.

У народ хадзілі Аляксандр ГОРБАЧ, Сяргей СКУЛАВЕЦ (фота).

АД ЛЮБІШЧЫЦ ДА БЕРЛІНА

3 ліпеня — Дзень вызвалення Беларусі ад нямецка-фашысцкіх захопнікаў

Кацярына Максімаўна Асіпік — жыхарка г. Івацэвічы. Ветэран вайны і працы.

У ваенны шпіталь трапіла 22 жніўня 1944 года, ужо пасля вызвалення Івацэвіцкага раёна ад фашыстаў. Іх, маладых дзяўчат — Кацю Кот, Алену Зыбайла і яшчэ чацвярых з вёсак раёна, выклікалі ў райком камсамола. Тады ўзначальваў яго Фёдар Савін, пасля размовы ўручыў накіраванне ў ваенны шпіталь. Ён часова размяшчаўся ў вёсцы Любішчыцы і рухаўся ўслед за 28-й арміяй трэцяга Беларускага фронта.



Каця Кот у ваенныя гады.



Кацярына Максімаўна — праз 58 гадоў.

Так Каця Кот стала санітаркай ваеннага шпіталя. Не думала дзяўчына, што столькі клопатаў будзе на ваеннай службе. А яна была ў ваеннай форме і лічылася салдатам. Дзень і ноч такія санітаркі, як Каця, дбалі пра раненых: кармілі іх, мылі вопратку, утрымлівалі ў чысціні памяшканне.

З Любішчыц шпіталь перавезлі на мяжу з Прусіяй, потым ва Усходнюю Прусію.

— Тут нам добра дасталася, — расказвае Кацярына Максімаўна. — Немец абстраляў шпіталь. Адзін снарад трапіў на кухню, у кацёл. Кантузіла начальніка шпіталя маёра Казарэзава. Набраліся тады мы страху...

Пад Кёнігсбергам шмат было параненых. Не хапала крыві для пералівання. Здавала сваю кроў і Каця, увесь медтэхперсанал. Трэба было ратаваць салдат. У свабодны ад работы час санітаркі неслі каравульную службу — па дзве гадзіны. Пападала і ноччу стаяць на пасту. З вінтоўкай было смялей.

Апошняе размяшчэнне шпіталя знаходзілася пад Берлінам. Месціліся ў бараках. Месцаў не хапала для параненых. Кожны прасіў дапамогі. Каця бегала ад ложка да ложка і старалася кожнага супакоіць, сказаць добрае слова. А яе ўсё клікалі і клікалі...

Тут, пад Берлінам, Каця Кот сустрэла Дзень Перамогі. Як дзеці, радаваліся ў той светлы дзень.

...Як склаўся далейшы лёс Каці Кот? У канцы 1945 года была дома ў вёсцы Быч. Потым выйшла замуж і перабралася ў Івацэвічы. Разам з мужам Аляксандрам Васільевічам Асіпікам выгадавалі двух сыноў. Абодва дарослыя і жанатыя. Асіпікі маюць трох унукаў.

Сама Кацярына Максімаўна працавала доўгі час у быткамбінаце, а апошнія 20 гадоў — у былой сельгасхіміі. Кіраўніцтва прадпрыемства не забывае свайго ветэрана. Раз у год, у Дзень Перамогі, наведваюць сваю былую запраўшчыцу.

Той-сёй можа сказаць: вось, маўляў, выбраў героя вайны. Гэта праўда, што не героя ў прамым сэнсе, але на такіх трымаліся перадфрантавыя ваенныя шпіталі, якія дапамагалі ставіць у строй параненых салдат. І ўрэшцерэшт выйгралі вайну — перамаглі. Гэтым і зараз ганарыцца Кацярына Асіпік.

Святаслаў КАЖАДУБ.
г. Івацэвічы.

Чыя ж гэта заслуга?



1996 год, мітынг на сядзібе Т. Касцюшкі.

Пра тое, што пачаліся буйныя аднаўленчыя работы на сядзібе Тадэвуша Касцюшкі каля г. Косава Івацэвіцкага раёна, многа пішуць і распавядаюць розныя СМІ Брэсцкай вобласці. Асабліва тыя СМІ, якія ўтрымліваюцца на дзяржаўных датацыях, ці, інакш кажучы, дзяржаўныя. Але вось сэнс іх паведамленняў зводзіцца да таго, што мясцовыя ўлады, вертыкаль, зыходзячы са сваёй нацыянальнай пазіцыі, займаліся і займаюцца аднаўленнем нацыянальнай спадчыны: рэканструкцыяй сядзібы нашага слаўнага земляка, што ва ўрочышчы Мерачоўшчына.

Ды толькі ці адпавядае гэта рэчаіснасці на самой справе? Проста, без каментарыя, выносім на суд чытачоў гэты сямігадовай даўнасці фотаздымак, які выпадкова трапіў у рэдакцыю газеты.

Хочацца проста адзначыць, што менавіта гэтымі людзьмі, што адлюстраваны на фота, была зроблена вялізная праца па аднаўленню і стварэнню хаця б прыстойнага выгляду сядзібы. А праца гэта часта суправаджалася не дапамогай, а нават супрацьдзеяннем з боку мясцовых і раённых улад. Хто ж атрымліваецца тут двурушнім: улады ці СМІ? Ці фота гэта — хлуслівае?

Сяргей СКУЛАВЕЦ.
г. Косава.

Не готовы к введению российского рубля

Власти Беларуси не готовы к введению российского рубля, несмотря на уступки России в этом вопросе. Такое мнение "Интерфаксу" высказал белорусский независимый эксперт Валерий Дашкевич.

"Национальный банк Республики Беларусь получил практически все полномочия, на которые рассчитывал, включая ограниченную возможность эмиссии безналичных денег, — отметил он. — У белорусского правительства было достаточно времени, чтобы унифицировать с Россией налоговую, бюджетную, таможенную и монетарную политику. Но сделано очень мало, так как реформы невозможны из-за отсутствия политической воли".

"Хартия-97".

Наступление ... на грабли

Реформа АПК: вопросов остаётся больше, чем ответов

Помните анекдот, заключающийся в кратком ответе чукчи на незатейливый вопрос на предмет того, как он, житель северных широт, оценивает результаты реформ и перестройки? "Реформа, — говорит чукча, — это тайга. Вверху шумит, а снизу тихо-тихо."

Около года назад в недрах системы АПК началось некое брожение умов. Невзирая на то, что руководитель страны неоднократно заявлял, что-де не видит альтернативы колхозам-совхозам, подготовлена дюжина вариантов их реформирования. К середине лета, выясняется, на Брестчине не должно остаться ни одного колхоза-совхоза. Ряд чиновников, подконтрольные властям СМИ уже чуть не потрясают рапортами, что реформа идёт полным ходом. Так, недавно в программе "Контуры" (канал ОНТ) прошёл сюжет об оригинальной форме реформирования хозяйств Лидского района: теперь все они объединены в холдинг, руководство избавляется от пьяниц и в приборы ночного видения выслеживают воров.

Можно подумать, до этого председатель ну никак не мог уволить алкаша, а контролировать сохранность урожая дозволялось лишь сложив ладонь козырьком над глазами. А то, что колхозники превратились в сотрудников холдинга... Помните ответ тургеневского героя на замечание племянничка, что-де он стал вдруг очень продвинутым? "Раньше вы все были болванами, а теперь стали нигилистами".

Так и у нас: реформированием АПК назвали смену шильды. И ради этого стоило копья ломать?



●

Если реформа была задумана именно в том варианте, в котором мы её нынче наблюдаем, то осталось схватиться за голову. Зачем? Зачем вы трясёте умирающую старуху? Её уже не спасти! Или дайте ей умереть спокойно, или займитесь поиском наследничка. Пёстрая, нарядная "хустачка", которую ей завязываем на голову, уже никого не обманет и не сделает её моложе.

Правда, иногда думается, дело в ином. И тут "старуху" обманули.

Вот, например, как оценивает происходящее председатель Белагропромсоюза, руководитель СКП "Остромечево" Алексей Скакун:

"Ведь реформа сама по себе акция недешёвая. Только для "Остромечево" смена вывески в СКП на сельскохозяйственное предприятие (а это сейчас обязательно), повлёкшая необходимость замены печати, бланков, лицензий и прочих атрибутов хозяйствования, обходится в 15 миллионов рублей. А в республике более трёх тысяч агропромышленных предприятий. Вот вам уже 45 миллиардов. Втянувшись в такую "реформу", легко довести затраты до 100 миллиардов рублей. А это больше той суммы, что выделяется государством для поддержания сельского хозяйства целой области." ("Белорусская нива", 2003 г.)

На практике так оно и есть. Под разговор о реформах у хозяйств вымываются последние средства. При этом, стоит заметить, как бы кардинальные изменения в статусе хозяйств произошли не день и не два назад. Так, бывший колхоз "Гривденский" (Ивацевичский район) уже давно "пристегнули" к Ивацевичскому райагропромснабу. Думаете, ситуация изменилась? Как были задержки зарплаты по 4-6 месяцев, так они и остались. Что это было? Реформирование?

Любопытно, что руководство Ивацевичского райсельхозпрода до недавнего времени (не день, не два — несколько месяцев) не удосужилось в собственных сводках поменять названия хозяйств. Так и печатали в местной районке: в "Рассвете" накосили, в "Гривденском" надоили... Хоть уже не было ни "Рассвета", ни "Гривденского". Даже в таком мизере реформирование сознания тех, кто должен сам контролировать реформирование других, весьма симптоматично.

Деревня тем временем медленно умирает. И всё под разговоры о реформировании.

Александр МИХАЛЕНКО.
г. Ивацевичи.



ТЕРРИТОРИЯ СВОБОДЫ

ЗДРАВСТВУЙ, РОВЕСНИК!

Если тебе от 14 и до 2..., то эта страничка для тебя и про тебя. Мы публикуем её регулярно. Если у тебя есть интересные идеи, добрые новости, хорошие советы — добро пожаловать на нашу Территорию Свободы! Эта территория для молодых и о молодых. Наша тусовка открыта для всех, вливайся!

Так уж получается, что Родину не выбирают. И через 5-10 лет именно от нас будет зависеть, в какой стране мы живём и что о ней думают другие. Пишите о том, что вас волнует, что больше всего интересует, какие материалы вы бы хотели увидеть на Территории Свободы.

* **NEXT** — наступнае.

Прощай, школа!



Грустная радость.



Вальс танцуют выпускники и будущие школьники.



Выпускницы лицея.

20 июня на центральной площади г. Ивацевичи состоялся торжественный праздник, посвящённый выпускникам средней школы.

В жизни каждого человека еть несколько знаковых событий, которые он помнит всю свою жизнь. Выпускной вечер, несомненно, относится к таким событиям. Даже погода в этот день вела себя подобно вежливой хозяйке, и сильнейший дождь с ветром прекратился буквально за несколько минут до начала торжественной церемонии.

В этом году в Ивацевичском районе 802 выпускника средних и 955 — базовых школ. Из них 43 закончили школу с золотыми и серебряными медалями. 33 медалиста в этом списке — из школ г. Ивацевичи (средняя школа №1 — 1 человек, средняя школа №3 — 12 медалистов, средняя школа №4 — 6, школа-лицей — 14).

Каждый из медалистов получил также районную книгу "Память" и цветы. Кроме медалистов школ города присутствовали и медалисты сельских школ. Их в этом году было 10 человек.

Удачи вам, ребята, успехов и исполнения всех самых заветных желаний!

Алексей ГРИШИН,
фото автора.
г. Ивацевичи.

Жизнь вручит свои медали

Из-за ужесточения требований к аттестатам с отличием только восемь средних школ Пружанского района имеют медалистов среди выпускников: Линовская, Рудникская, Могилевецкая, Щерчёвская, СШ №1, №5 г. Пружаны, Ружанская и гимназия. Кстати, последние две отличились наибольшим количеством отличников.

Всего медали высшей пробы, а также серебряные заслужили 24 человека.

Николай АРАБЕЙ.
г. Пружаны.

Чего вы ждёте от этого лета?

Отвечает молодёжь Ивацевичского района




СЕРГЕЙ И МАРИНА: Хотим свить своё гнёздышко и не зависеть ни от кого. Надеемся, что уже этим летом наша мечта осуществится.




КИРИЛЛ: Хочу этим летом найти свою вторую половинку и жениться на ней. Планов очень много. А вообще — хочется денег и побольше.



НАТАША: Хочу изменить свою жизнь в лучшую сторону. Надеюсь, что успешная учёба, а в дальнейшем — работа, бизнес и карьера помогут в этом.



САША И ОЛЬГА: Хочется перемен в лучшую сторону. Планируем начать строительство дома этим летом. Наверное, в наше время это главное — иметь своё жильё.



ВАДИМ: У меня есть дача. Хочу сделать из неё маленькую сказку, в которой я буду жить вместе со своей принцессой. И всё у нас будет хорошо, как в сказке.



НАТАЛЬЯ И АНЖЕЛА: Надеемся, что этим летом наша жизнь, довольно серая в последнее время, станет более интересной и весёлой. Хочется изменений к лучшему.

В народ ходил Алексей ГРИШИН,
фото автора.

ГАЗЕТА ДЛЯ ВАС от Алексея "ДЕСЯТОЧКА" мая



1	**"Фабрика"** "Про любовь"	1
2	**Ю. Шатунов и Eminem** "Детство With Out Me"	2
3	**Н. Ветлицкая** "Глаза цвета виски"	3
4	**"Корни"** "Я теряю корни"	4
5	**"DDT"** "Это твоя Родина, сынок"	5
6	**Shakira** "Objection (Tan 90)"	6
7	**Б. Моисеев** "Ржавчина"	7
8	**Scooter** "Devil Drums"	8
9	**"Иванушки Int"** "Дальние моря"	9
10	**"Вирус"** "Наоборот"	10

Выиграй приз — любимую музыку!

1. Впиши в купон свою, лучшую "десяточку" июня.
2. Вырежи купон, принеси его в редакцию или отправь его нам до 10 июля. На конверте сделай пометку "Хит-парад".
3. По итогам всех присланных купонов будет составлен наш майский хит-парад. Участник, чья "десятка" наиболее точно совпадёт с нашей, получит приз — две аудиокассеты.

На этот раз победил в нашем хит-параде житель д. Панки Ивацевичского района Кирилл Крыжановский. В качестве приза он получает два компакт-диска с лучшими блюзами минувшего столетия. Призы предоставлены лучшей дискотекой города Ивацевичи — ДИСКОТЕКОЙ "ТОЧКА".

ПАКУЛЬ БУДЗЕ ЗАПАТРАБАВАНА НЯПРАЎДА

Аб тым, што жыхары Беларусі сталі заложнікамі няпраўды, сведчаць факты нашага з вамі жыцця. Няпраўду парадзіла савецкая сістэма, яна і цяпер вялікімі патокамі льецца з экрана беларускага тэлебачання і са старонак дзяржаўных беларускіх газет. Нас убаюкваюць казкамі пра стабільнасць эканомікі, правільнага абранага краінай курсу.

Хлусня адняла ў беларусаў вельмі многае: свабоду, матэрыяльны дабрабыт і адымае нават само жыццё.

Яшчэ зусім нядаўна нас было болей за 10 мільёнаў, а зараз меней дзесяці. Апошнім часам кожны год вымірае, прыкладна, каля 50 тысяч, а ў 2002-52,4 тысячы чалавек, г.зн. па цэламу раёну. Наступіла расплата за наша раўнадушша да маны і прыняцце яе.

Усім вядома, якую страшную бяду прынёс Чарнобыль. Першы паслячарнобыльскі тыдзень быў "тыднем хлусні". Спачатку спробы, як было заўсёды ў практыцы савецкага кіраўніцтва, схаваць, што адбылося ў Чарнобылі, затым — зменшыць маштабы бяды, абмануць людзей, не сказаць ім праўды, спадзяваючыся заспакоіць.

Прымаемая намі да гэтага часу мана прывяла да вялікага ўсплеску захворванняў, якія не даюць магчымасці жыць.

А на Захадзе, дзе нават пасыпаўся чарнобыльскі попел, гэтага не адбылося. Кіраўнікі і навукоўцы адкрыта гаварылі аб смяротэльнай пагрозе і адразу кінуліся зберагаць здароўе кожнага, хто аказаўся ў небяспецы.

А мы скрозь пальцы глядзім на тое, што працягласць жыцця нават па афіцыйных дадзеных скарацілася да 59-62 гадоў, што вымiраюць дзеці і маладыя людзі, асабліва тыя, каму на момант аварыі было ад некалькіх тыдняў да шасці гадоў.

